**Буднік Е.М.**

# СТАРЫ ГРОДЗЕНСКІ НЕКРОПАЛЬ: ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

*Ключавыя словы:* Гродна, могілкі, турызм, ахова, рэстаўрацыя

Некропаль – гэта вялікі комплекс пахаванняў. Ён, як правіла, уключае ў сябе грабніцы, склепы і надмагіллі. Некропалі валодаюць гістарычнай і архітэктурнай каштоўнасцю, і з'яўляюцца музеем пад адкрытым небам. Пер-Лашэз у Парыжы, Хайгейт у Лондане, Вадзі ас-Салам у іракскім горадзе Ан-Наджаф, Рэкалета ў Буэнас-Айрэсе, Нацыянальныя могілкі ў Арлінгтане ў Злучаных Штатах Амерыкі, Горад мёртвых у Каіры – усе гэтыя аб'екты з'яўляюцца аб'ектамі высокай гісторыка-культурнай значнасці, і, акрамя таго, прыцягваюць пэўны сегмент турыстаў [1, с. 4].

Гродзенскі некропаль складаецца з чатырох могілак – праваслаўных, каталіцкіх, ваенных і яўрэйскіх.

Праваслаўныя могілкі афіцыйна з'яўляюцца самымі старымі могілкамі ў Рэспубліцы Беларусь. Тут пахаваны архітэктар Гродзенскага Пакроўскага сабора, Сяргей Мікалаевіч Ланскі – генерал-лейтэнант, які загінуў ад раны ў 1814 годзе, Міхась Васілёк і Міхась Багун – беларускія паэты. Кожная магіла ўнікальная, і ўсе яны аўтарскія. На каталіцкіх могілках пахаваныя Эліза Ажэшка, Джузэпэ Сака – гродзенскі архітэктар, які працаваў пры Антоніі Тызенгаўзе, Ян Каханоўскі. На Вайсковых – Капліца генерала-маёра рускай арміі, маршалка дваранства Гродзенскага павета, Ганаровага сусветнага суддзі Гродзенскай акругі Аляксандра Русаў (1834–1896), усяго ў індывідуальных і брацкіх магілах на Вайсковых могілках пахавана звыш васьмі тысяч чалавек. На старых габрэйскіх могілках многія магільныя пліты ўжо сышлі пад зямлю [7, с. 5]. Францысканскія могілкі былі заснаваны ў XVIII ст. на левым беразе Нёмана [10, с. 5].

"Старыя могілкі ў Гродне займаюць плошчу больш за тры гектары, лічацца не толькі самымі старымі, але і аднымі з самых вялікіх у Беларусі. Гродзенскі некропаль цікавы тым, што сабраў мноства прыгожых і незвычайных помнікаў. Толькі тут захаваліся шматлікія архітэктурныя формы і стылі, якія 150–200 гг. таму можна было сустрэць у самім Гродне, але да нашых дзён не захаваліся", – піша Sputnik Беларусь [9, с. 5].

Аднак на сённяшні дзень праваслаўныя і каталіцкія могілкі патрабуюць далейшага добраўпарадкавання. Некропалі з'яўляюцца аб'ектамі прыцягнення для асоб, якія цікавяцца гісторыяй горада, гісторыяй жыцця людзей, якія пахаваныя на могілках, архітэктурай помнікаў, сімволікай некропаляў.

Аб'ектам, якія валодаюць гісторыка-культурнай каштоўнасцю і архітэктурнай каштоўнасцю, неабходнаі надалей надаваць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, што забяспечыць ім дадатковы кантроль [1, с. 3]. Акрамя таго, па факце гістарычнай і архітэктурнай значнасці, уваход на могілкі можна зрабіць платным для экскурсійных груп або асоб, жадаючым самастойна наведаць могілкі, але за сімвалічную суму. З аднаго боку дадзеная ініцыятыва знізіць рызыку наведвання могілак асобамі без пэўнага месца жыхарства, у алкагольным або наркатычным ап'яненні, з другога – паспрыяе фінансаванню абнаўлення і рэстаўрацыі помнікаў, агульнага догляду за могілкамі [2, с. 5]. Радуе, што крокі ў гэтым нікурунку ўжо робяцца. Напрыклад, ідзе рэстаўрацыя магілы генерала Ланскога [4, с. 7].

На каталіцкіх могілках размешчана магіла Баляслава Шышкевіча – майстра і скульптара, які выканаў вялікую колькасць помнікаў і надмагілляў для гродзенскіх некропаляў. На яго магіле размешчана скульптура Дзевы Марыі – сімвал нябеснай абароны. Аднак помнік знаходзіцца ў жаласным стане – галава Маці Божай адарваная, і дзе яна размяшчаецца – невядома. Сам помнік выцвіў і пакрыўся цвіллю [8, с. 5].

Калісьці ў Гродне былі тры яўрэйскія кіркуты: адзін ў раёне сінагогі, на тэрыторыі другога ў 1960-х гадах быў пабудаваны стадыён «Чырвоны сцяг» (цяпер –

спартыўны комплекс “Нёман”), і трэці, адзіны з захаваных – на левым беразе Нёмана. Самае старое пахаванне на ім датавана 1784 годам. На гэтым кіркуце, напрыклад, пахаваны Георгій Ніселевіч Хасід – вязень Гродзенскага гета, які выжыў. Дзякуючы яго ўспамінам можна даведацца, якім зверствам падвяргаліся яўрэі ў Гродне падчас акупацыі. Памёр Г.Н. Хасід у 2013 г. Надпісы на надмагіллях зроблены на ідышы і на іўрыце. Могілкавая сцяна мае пралом у некалькіх месцах, могілкі зараслі. Многія магільныя пліты сышлі пад зямлю, пакрыліся мохам, зараснікамі [6, с. 5].

У большай ступені ў ахове і рэстаўрацыі маюць патрэбу каталіцкія фарныя і праваслаўныя могілкі. Гарадзенскія краязнаўцы ўздымалі гэтае пытанне, канструктыўныя крокі мясцовымі ўладамі робяцца, аднак праблема ўсё яшчэ існуе [11].

Час ад часу энтузіясты-краязнаўцы ладзяць экскурсіі па могілках, аднак трэба скласці кантрольны тэкст і тэхналагічную карту экскурсій.

Ідэальным развіццём падзей была б музеефікацыя арыгінальных пахавальняў, скульптур і іншых помнікаў, у той час як на могілках ўсталяваць замены гэтым помнікам, максімальна набліжаным да арыгіналу па вонкавым выглядзе, але з больш танных матэрыялаў.

Можна распрацаваць сайт некропаля, дзе змясціць падрабязнае апісанне кожнай магілы і помніка, фатаграфію, дакладную лакалізацыю на плане з тлумачэннем, як туды прайсці, звесткі пра таго, хто тут пахаваны, гісторыя жыцця, калі магчыма яе вывучыць, абставіны смерці. Акрамя папулярызацыі, гэта спросціць пошук інфармацыі для жыхароў горада і турыстаў. На дадзены момант такая практыка ўжываецца, напрыклад, у некропалі Севастопаля і Крымскім некропалі, Ваганькаўскім некропалі. «У залежнасці ад сайта, могуць спатрэбіцца прозвішча, імя, даты нараджэння і смерці, населены пункт, дзе памёр або быў пахаваны чалавек», – піша Маскоўскі даведнік рытуальных паслуг. На магілах вядомых людзей можна павесіць QR-код, у якім таксама будзе ўся інфармацыя аб памерлым [3, с. 4].

Такім чынам, некропалі з’яўляюцца аб’ектам высокай культурна-гістарычнай і архітэктурнай каштоўнасці. Яны ўтрымліваюць пахавальні, склепы, скульптуры і помнікі. “У глыбінях зямлі Нашых душ карані”, – пісаў Н. Гілевіч. Гродзенскі некропаль з’яўляецца важкім падмуркам ў патрыятычным выхаванні, сродкам якога выступае і турызм. Сённяшні дастаткова выразны ўздым турыстычнай цікавасці да Гродна, павялічвае ўвагу да ніх, як найкаштоўнейшага турыстычнага рэсурсу. Яшчэ большая актывізацыя добраўпарадкавання могілак дазволіць уключыць іх у кола актыўнага турыстычнага ўжытку, як у межах уязднога, так ва ўнутраным турызме. Бо кожны некропаль – гэта сапраўдны скансэн, які дэманструе захаванне памяці месца.


1.Библиофонд [сайт]. – 2016. – URL: https://www.bibliofond.ru/view.aspx?id=884243#text (дата обращения: 19.09.2025).

2.КиберЛеника [сайт]. – Москва, 2021. – URL: https://www.google.com/url?sa=t&source=web&rct=j&opi=89978449&url=https://cyberleninka.ru/article/n/hudozhestvennyy–nekropol–kak–obekt–istoriko–arhitekturnogo–naslediya–problemy–sohraneniya–rossiyskiy–i–evropeyskiy–opyt&ved=2ahUKEwiy58WWyOWPAxWHKBAIHevPC1wQFnoECE0QAQ&usg=AOvVaw0GkHVH_AQVPbS2XcLYXR–o (дата обращения: 19.09.2025).

3.Московский справочник ритуальных услуг [сайт]. – Москва, 2018. –URL: https://www.mos–ritual.ru/informatsiya/stati/kladbischa–v–virtualnoy–realnosti (дата обращения: 10.09.2025).

4.Нестеренко, С. Гродненский православный некрополь / С. Нестеренко. – Гродно, 2024. – С. 13–14. – (Серия «Гродненские ангелы»).

5.angelam [сайт]. – Гродно. – URL: https://www.mamgrodno.com/projects/angelmam.html (дата обращения: 19.09.2025).

6.Olgatravel [сайт]. – Гродно, 2023. – URL: https://www.youtube.com/watch?v=9vFF_v67Ur0&pp=ygU70L7Qu9GM0LPQsCDRgtGA0LXQstC10Lsg0LXQstGA0LXQudGB0LrQvtC1INC60LvQsNC00LHQuNGJ0LU%3D (датаобращения: 19.09.2025).

7.planetaBELARUS [сайт]. – Гродно, 2018. – URL: https://planetabelarus.by/sights/grodnenskie–nekropoli/ (дата обращения: 19.09.2025).

8.poshyk.info[сайт]. – 2023. – URL: https://poshyk.info/mogilki–grodna/ (дата обращения: 19.09.2025).

9.SputnikБеларусь [сайт]. – 2023. – URL: https://sputnik.by/20211102/gorod–mertvykh–zazheg–ogni–stareyshee–kladbische–belarusi–na–dzyady–1057618454.html (дата обращения: 19.09.2025).

10.tourgrodno.by [сайт]. – Гродно, 2019. – URL: https://tourgrodno.by/information/monuments/kladbishze/pravoslavnoe–i–katolicheskoe–kladbischa–po–pereulku–pobedyi–.html (дата обращения: 19.09.2025).

11. Кондратьева, Т. Историки из Гродно добиваются включения местного некрополя в список историко-культурных ценностей / Т. Кондратьева. – URL: https://www.sb.by/articles/spory–na–pogoste.html (дата обращения: 19.09.2025).